# ВЫКАРЫСТАННЕ РЭСУРСАЎ СЕТКІ ІНТЭРНЭТ У ПРАЕКТНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

**Л. У. Кулік**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога», кафедра «Беларуская і замежныя мовы»*

Выкладанне замежных моў уваходзіць у склад агульнай сістэмы адукацыі, і таму яно падпарадкоўваецца асноўным тэндэнцыям развіцця гэтай сістэмы. У апошні час назіраецца сусветная скіраванасць на гуманізацыю адукацыі, што пад час выкладання замежнай мовы выяўляецца ў арыентацыі на развіццё асобы студэнта. Дадзены падыход азначае абавязковы ўлік індывідуальна-псіхічных асаблівасцей навучэнцаў, мэтанакіраванае фарміраванне гэтых асаблівасцей, агульнакультурнае развіццё студэнтаў з прадстаўленнем магчымасцей самастойна выявіць свае творчыя здольнасці.

Адным з метадаў актывізацыі самастойнай работы студэнтаў пры авалоданні замежнай мовай з’яўляецца праектная дзейнасць. Узнікшы ў дваццатыя гады мінулага стагоддзя, дадзеная методыка не перастае быць актуальнай, а з развіццём сучасных камп’ютарных тэхналогій рэалізуецца па-новаму.

Праект уяўляе сабой не проста работу, якая плануецца і ажыццяўляецца студэнтамі самастойна. Гэта цэлае даследаванне, якое з’ўляецца інтэграцыйным сродкам развіцця, навучання і выхавання, які дазваляе выпрацоўваць і развіваць спецыфічныя ўменні і навыкі праектавання і даследавання ў навучэнцаў. Пры падрыхтоўцы праекта выкладчык толькі каардынуе дзейнасць студэнтаў, якія даследуюць канкрэтную абраную тэму, збіраюць найбольш поўную інфармацыю пра яе, сістэматызуюць атрыманыя дадзеныя і прадстаўляюць іх, выкарыстоўваючы тэхнічныя сродкі, у тым ліку, сучасныя камп’ютарныя тэхналогіі.

Асноўная ідэя праектнай работы пры выкладанні англійскай мовы складаецца ў тым, каб перанесці акцэнт з разнастайных практыкаванняў на актыўную разумовую дзейнасць студэнтаў, якая патрабуе авалодання пэўнымі моўнымі сродкамі. Толькі метад праектаў дазваляе вырашыць гэту дыдактычную задачу і пераўтварыць заняткі па англійскай мове ў даследчы клуб, у якім вырашаюцца на самой справе цікавыя праблемы з улікам асаблівасцей культуры краіны носьбітаў англійскай мовы.

Глабальная камп’ютарызацыя робіць найбольш актуальнымі на сенняшні дзень тэлекамунікацыйныя праекты.

Тэлекамунікацыйны праект – гэта «сумесная вучэбна-пазнавальная, творчая дзейнасць навучэнцаў-партнераў, якія маюць агульную праграму, мэту, метады, спосабы дзейнасці, накіраваныя на дасягненне агульнага рэзультату і арганізаваныя на аснове камп’ютарных тэлекамунікацый» [1, с. 3]. Менавіта такія праекты дазваляюць вырашыць складаную дыдактычную задачу – стварэнне моўнага асяроддзя і на яго аснове запатрабаванне ва ўжыванні англійскай мовы на практыцы. Сусветнае выкарыстанне інтэрнэту стварае неабходныя ўмовы для атрымання неабходнай студэнтам інфармацыі. Кожны карыстальнік інтэрнэту мае магчымасць

падабраць неабходны матэрыял, знайсці патрэбны артыкул і іншыя крыніцы інфармацыі на англійскай мове. Гэта інфармацыя з'яўляецца аўтэнтычнай і ў час працы з ей можна атрымаць усе неабходныя дадзеныя па праблеме, над якой працуюць студэнты ў межах праекта.

Работа над тэлекамунікацыйным праектам падзяляецца на пяць этапаў:

1) планаванне;
2) аналітычны этап;
3) этап абагульнення інфармацыі;
4) прэзентацыя;
5) падвядзенне вынікаў і рэфлексія.

Планаванне работы над праектам пачынаецца з яго калектыўнага абмеркавання. Гэта, перш за ўсе, абмен думкамі на аснове ўжо існуючых ведаў па замежнай мове, а таксама паведамленні аб сайтах, на якіх можна знайсці карысную інфармацыю і прыняць удзел у абмеркаванні актуальных пытанняў па тэме даследавання. На гэтым этапе кожны студэнт вызначае падтэму для свайго будучага даследавання.

На аналітычным этапе студэнт назапашвае патрэбныя звесткі, а затым абагульняе іх. Удзельнікі праекту збіраюць інфармацыю са ўсяго свету, абменьваюцца думкамі на англійскай мове, уступаюць у дыскусіі на форумах. Абмен інфармацыяй адбываецца праз электронную пошту, а калі есць магчымасць і ва ўмовах рэальнага часу. Такім чынам, ствараецца моўнае асяроддзе, што спрые фарміраванню затарабавання ў выкарыстанні англійскай мовы як сродка рэальных зносін у працэсе міжмоўнага ўзаемадзеяння. Студэнты, якія вывучаюць замежную мову, кожны раз знаемяцца не толькі з інфармацыяй, каштоўнай пры вырашэнні іх агульнай праблемы, але і з асаблівасцямі культуры сваіх партнераў.

Пад час прэзентацыі студэнт прадстаўляе свае даследаванне з абавязковай дэманстрацыяй зместу на маніторы камп'ютара альбо мультымедыа. Галоўнай вартасцю такога віду прэзентацыі з'яўляецца нагляднасць матэрыялу, успрыманне якога адбываецца не толькі праз зрок, але і слых, што дазваляе стварыць пэўны эмацыянальны фон, які павялічвае эфектыўнасць засваення матэрыялу. Важна зазначыць, што наяўнасць гіперспасылак дазваляе атрымаць тлумачэнні альбо дадатковую інфармацыю ў час прэзентацыі і вярнуцца да яе асноўнага зместу.

Такім чынам, выкарыстанне новых інфармацыйных тэхналогій не толькі разнастаіць вучэбны працэс, але і адкрывае вялікі матывацыйны патэнцыял і спрыяе прынцыпам індывідуальнага навучання. Праектная дзейнасць дазваляе навучэнцам выступаць у ролі стваральнікаў і, самае галоўнае, пашырае моўныя веды. Выкарыстанне рэсурсаў сеткі інтэрнэт павялічвае узровень практычнага валодання англійскай мовай і кам'ютарам, фарміруе навыкі самастойнай дзейнасці. Менавіта студэнт, а не выкладчык, вызначае, што будзе змяшчаць праект і ў якой форме пройдзе яго прэзентацыя.

Літаратура

1. Полат, Е. С. Метод проектов на уроках иностранного языка / Е. С. Полат // Иностр. языки в шк. – 2000. – № 2. – С. 3–10.